# ЛЕКТАР І ЖЫЦЦЁ

Работа ўніверсітэцкай групы таварыства «Веды» вызначалася і вызначаецца пастановай чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС, якое гучыць як заклік: «Пачэсны абавязак савецкіх вучоных—несці веды ў масы». Кожны з нас добра разумее, што веды палітычныя, гісторыка-філасофскія, прыродазнаўча-навуковыя і іншыя павінны стаць здабыткам усіх, што навукова-папулярныя лекцыі, даклады, гутаркі прызваны дапамагчы партыі ў выхаванні новага чалавека, узброенага трывалымі навуковымі ведамі, ідэйна перакананага, актыўнага будаўніка камунізма.

Наша група, якая налічвае 270 чалавек, за апошнія некалькі гадоў стала працаваць больш актыўна і ініцыятыўна; больш змястоўнымі і актуальнымі, цікавымі і выразнымі, з пункту гледжання формы, сталі лекцыі і гутаркі нашых таварышаў. Мы імкнёмся чытаць лекцыі так, каб яны запаміналіся, узнімалі цікавасць і любоў да навуковых ведаў. Універсітэцкая група пастаянна праводзіць лекцыйную прапаганду ў падшэфнай вайсковай часці, на трох буйных заводах Мінска, у інтэрнатах будтрэста № 5, на прадпрыемствах і ў школе г. Барысава, у чатырох населеных пунктах Барысаўскага раёна. На адным толькі аўтамабільным заводзе летась было прачытана каля 1500 лекцый, а ў студзені і лютым гэтага года — 400.

Але справа не толькі у колькасці лекцый. Важна, што ў справу масавай навуковай прапаганды актыўна ўключаюцца кафедры, аспіранты, студэнты. Заслугоўвае ўвагі вопыт работы кафедраў рускай літаратуры (загадчык праф. Л. І. Фіглоўская), беларускай літаратуры (загадчык — праф. М. Р. Ларчанка), якія наладжваюць выезды кафедраў на аўтазавод. У пачатку сакавіка члены гэтых кафедраў на заводзе праводзілі гутаркі пра творчасць Т. Р. Шаўчэнкі. Кафедра гісторыі філасофіі (загадчык — праф. І. М. Лушчыцкі) праводзіць навукова-атэістычную прапаганду ў калгасах і на падшэфных прадпрыемствах. Кафедра эканамічнай геаграфіі (загадчык — праф. Н. Е. Рагозін) арганізавала цыкл лекцый «Ля палітычнай карты свету» на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Вялікую работу праводзяць супрацоўнікі хімічнага факультэта. Яны часта выступаюць з лекцыямі на прадпрыемствах горада і ў калгасах рэспублікі. У апошні час актыўна вядуць лекцыйную прапаганду нашы аграхімікі (лабараторыя акад. І. С. Лупіновіча). Вялікую работу праводзяць супрацоўнікі і аспіранты біялагічнага факультэта (праф. Г. Г. Вінберг, праф. П. Ф. Ракіцкі, дац. Б. Ф. Осіпаў, загадчык заалагічнага музея В. Н. Маліноўскі і іншыя). Супрацоўнікі і аспіранты фізічнага факультэта (праф. У. Г. Вафіядзі, праф. І. Р. Некрашэвіч, дац. А. А. Лабуда і іншыя) удзельнічаюць у правядзенні цыклаў лекцый для салдат, школьнікаў і настаўнікаў. Неабходна адзначыць плённую працу нашых матэматыкаў у школе юных матэматыкаў і ва ўніверсітэце для настаўнікаў.

Другі фронт нашай дзейнасці—студэнцтва. Актыўна працуюць на некаторых факультэтах лекторыі і дыскусійны клуб «Ведаць, шукаць, змагацца». Адбыліся сустрэчы з ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, з Героямі Савецкага Саюза, актыўнымі удзельнікамі партызанскага руху, старымі камуністамі, пісьменнікамі. **Выхаванне на рэвалюцыйных, баявых традыцыях, выхаванне ў духу савецкага патрыятызму займае пачэснае месца ў рабоце нашых лекторыяў.** Неабходна больш увагі звярнуць на такія дзейсныя формы выхаваўчай работы, як дыскусійныя клубы, сустрэчы з вядомымі людзьмі, вечары пытанняў і адказаў. Неабходны цыклы мэтанакіраваных лекцый, бо аўдыторыя стала больш дыферэнцыраванай, у сэнсе сваёй падрыхтоўкі. Акрамя таго, праз цыклы лекцый усталёўваецца больш цесны кантакт са слухачамі і магчыма, такім чынам, адваротная сувязь.

Мы павінны клапаціцца пра папаўненне радоў лектараў за лік студэнтаў і аспірантаў. У гэтых адносінах ўзрастае роля школы маладога лектара, якая мае ў сабе вялікія патэнцыяльныя магчымасці. Мяркую, што «аддача» гэтай школы пачнецца ў бліжэйшы час. Мы павінны расшырыць склад лектараў, што выступаюць на навукова-атэістычныя тэмы. Неабходна прыцягнуць да гэтай справы біёлагаў, фізікаў, хімікаў. Мы павінны разумна выкарыстаць сілы нашых буйных вучоных для рэцэнзавання, кансультацыі, для напісання навукова-папулярных кніг, прыцягнуць іх да навукова-метадычнай работы. Неабходна шырэй прыцягваць усе кафедры да вуснай і друкаванай лекцыйнай прапаганды. Хацелася б, каб нашы грамадскія кафедры ўзмацнілі гісторыка-філасофскую лекцыйную прапаганду на падшэфных прадпрыемствах.

Лекцыйная прапаганда павінна быць не справай асобных энтузіястаў, а справай усяго калектыву навуковых работнікаў, аспірантаў, студэнтаў універсітэта. Група таварыства «Веды» зробіць максімум таго, што мы можам і абавязаны зрабіць у лекцыйнай прапагандзе.

**Дацэнт М. РЭЗНІКАЎ,**
**старшыня бюро групы таварыства «Веды» БДУ.**

## Хімічныя веды—у масы

«Вялікая хімія Беларусі», «Аб развіцці хіміі і хімічнай прамысловасці ў святле рашэнняў снежаньскага Пленума ЦК КПСС». «Значэнне палімераў у народнай гаспадарцы», «Як хімія выкрывае «цуды» рэлігіі» — з гэтымі і многімі іншымі тэмамі выступалі супрацоўнікі і студэнты хімічнага факультэта перад рабочымі аўтамабільнага завода і завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, фабрыкі імя Э. Тэльмана, а таксама ў Калінкавіцкім, Чачэрскім раёнах і г. Гомелі. Усяго за студзень і люты прачытана каля васьмідзесяці лекцый. Найбольш актыўны удзел у гэтай рабоце прымаюць кандыдаты хімічных навук В. Ф. Цікавы, М. П. Гілевіч, В. Г. Шлык, асістэнт Г. А. Браніцкі.

Аднак зусім недастаткова удзельнічаюць у лекцыйнай рабоце студэнты. Перад ад'ездам на зімовыя канікулы каля пяцідзесяці чалавек атрымалі даручэнні выступіць з дакладамі ў школах рэспублікі, але толькі сямёра выканалі гэтае даручэнне. Прычым першакурсніцы Ляхава і Мяльгуй выступалі ў школах з дэманстрацыяй займальных вопытаў па хіміі.

**(Наш кар.).**

## *Часцей сустракацца з героямі працы*

Прапагандаваць навуку, літаратуру, мастацтва, выхоўваць маладое пакаленне на рэвалюцыйных і працоўных традыцыях — агульнадзяржаўная справа. На філалагічным факультэце гэтую вялікую і важную работу члены таварыства «Веды» праводзяць сумесна з партыйнай арганізацыяй, дэканатам і кафедрамі.

Не так даўно ў акадэмічных групах ішло вывучэнне матэрыялаў снежаньскага і лютаўскага Пленумаў ЦК КПСС. Крыху раней адбылася сустрэча з удзельнікамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, а таксама з былымі партызанамі. Герой Савецкага Саюза Осіпава шмат цікавага расказала пра гераізм савецкіх партызан і падпольшчыкаў. З. Міхайленка-Хацеева, член падпольнай арганізацыі г. Людзінава, пазнаёміла з біяграфіямі сваіх баявых сяброў, якія аддалі сваё жыццё за свабоду Радзімы. На адным з вечароў філолагі сустрэліся з Героем Савецкага Саюза Г. Такуевым, пра якога расказваецца ў кнізе «Пад адным сцягам», з народным артыстам СССР Я. Цікоцкім, з народным артыстам БССР З. Стомам.

На асобныя мерапрыемствы, што праводзяцца на філфаку, запрашаем жыхароў Ленінскага раёна. На аўтазавод выязджалі члены кафедраў беларускай і рускай літаратуры. Яны чыталі лекцыі ў цэхах пра творчасць Д. Беднага, А. Серафімовіча, Т. Р. Шаўчэнкі, разам з рабочымі адзначалі знамянальныя даты, праводзілі дыспуты па кнігах, сустрэчы з пісьменнікамі.

Ахвотна ўдзельнічаюць ў рабоце групы таварыства «Веды» прафесары Ларчанка, Фіглоўская, дацэнты Мялкіх, Захарава, Ішчанка, Казлова, Лапідус, кандыдаты філалагічных навук Галаўко, Карабан.

У заключэнне хочацца нагадаць, што яшчэ не ўсе выкладчыкі ўдзяляюць увагу сур'ёзнай, карпатлівай, паўсядзённай лекцыйнай рабоце. Зусім мала гутарак прысвячаецца хіміі, атэістычнай прапагандзе. Часцей у нашых аўдыторыях мы павінны сустракаць герояў працы.

**Дацэнт С. А. ЛЫСЕНКА.**

## Моладзь, больш актыўнасці

Прапаганда палітычных і навуковых ведаў — пачэсная задача членаў таварыства «Веды». Цяпер яна асабліва важная ў сувязі з уздымам народнай гаспадаркі краіны на новую ступень развіцця. У той жа час яна стала яшчэ больш цяжкай, бо павысілася падрыхтоўка той аўдыторыі, сярод якой вядзецца работа, рэзка павялічыліся патрабаванні да вуснага слова лектараў, пашырылася кола інтарэсаў.

Вось чаму нам неабходна падумаць пра павышэнне ўзроўню лекцый, пра большую іх дыферэнцыроўку, з улікам падрыхтоўкі слухачоў. Было б вельмі добра частку тэкстаў друкаваць на гектографе ці нават у друкарні. Гэтымі днямі адбыўся пленум ідэалагічнай камісіі па пытаннях стварэння навукова-папулярнай літаратуры. Відаць, добрыя навуковыя лекцыі для слухачоў рознай падрыхтоўкі — адна з форм навукова-папулярнай літаратуры. На маю думку, добрая лекцыя або кніга на прыродазнаўча-навуковую тэму, якая фармулюе навуковыя ўяўленні ў слухачоў і чытачоў, якая даказвае аб'ектыўную правільнасць законаў свету, — гэта самы дзейсны і важны спосаб выпрацоўкі і матэрыялістычнага светапогляду.

Пакуль што лекцыйная работа вядзецца пераважна вузкай праслойкай членаў таварыства. Таму неабходны больш актыўны ўдзел у ёй многіх членаў таварыства, асабліва моладзі — студэнтаў і аспірантаў.

**Прафесар П. Ф. РАКІЦКІ.**



* * *

*Матэрыяламі гістарычнага музея часта карыстаюцца ў сваей рабоце члены ўніверсітэцкай групы таварыства «Веды». Ад своечасовага афармлення экспазіцый часам залежыць эфектыўнасць выкарыстання наяўнага гістарычнага матэрыялу ў лекцыях і дакладах.*

*На здымку: выкладчык гістфака Л. А. Міхайлоўскі, супрацоўнікі музея Ф. І. Адашчык і А. І. Котаў за падрыхтоўкай экспанатаў.*

## Эканамічная канферэнцыя ў калгасе

**Кафедра палітычнай эканоміі правяла пасяджэнне членаў кафедры ў калгасе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Дзяржынскага раёна. З дакладам выступіў дацэнт Ц. А. Базылеў. Тэма даклада — «Інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі — аснова развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці калгасаў». Ц. А. Базылеў даў рэкамендацыі асноўнага кірунку развіцця калгаса ў бліжэйшыя гады. Вялікая частка даклада была прысвечана растлумачэнню дакументаў снежаньскага і лютаўскага Пленумаў ЦК КПСС і матэрыялаў нарады работнікаў сельскай гаспадаркі, якая адбылася ў канцы лютага ў Маскве.**

**Пасля дзелавой часткі адбыўся шэфскі канцэрт мастацкай самадзейнасці матэматычнага і фізічнага факультэтаў. Калгаснікам, а іх прысутнічала больш як 350 чалавек, вельмі спадабалася сустрэча з пасланцамі БДУ. Яны прасілі часцей рабіць такія выезды.**

**М. ЯРАВІКОЎ,**
**заг. кабінета палітычнай эканоміі.**

## *150 лекцый на рахунку біёлагаў*

Летась члены групы таварыства «Веды», што працуюць на біяфаку прачыталі для насельніцтва рэспублікі больш як 150 лекцый. Іх слухалі на аўтамабільным заводзе, на біястанцыі, у школах, калгасах рэспублікі, на возеры Нарач.

Часцей за іншых выступалі з чытаннем лекцый прафесар П. Ф. Ракіцкі, дацэнт Б. Ф. Осіпаў, супрацоўнікі біяфака О. І. Калешка, В. Е. Янушэўскі, А. В. Лешына, Л. Н. Маліноўскі. Некаторыя з іх за актыўную работу ў таварыстве «Веды» атрымалі прэміі: праўленне таварыства ўзнагародзіла іх падпіскай на перыядычныя выданні.

У сакавіку старэйшыя вучоныя — члены таварыства — зрабілі серыю дакладаў для былых выпускнікоў факультэта і для універсітэта. У дакладах гэтых распрацаваны актуальныя тэмы аб дасягненнях біялагічнай навукі.

(Наш кар.).

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

Бібліятэка ўніверсітэта атрымала новыя кнігі. Сярод іх:

**Щеглов А. В.** Развитие марксистской философии в трудах В. И. Ленина. Изд. 2-е. М., Росвузиздат. 1963.

**Джавадов Г. А.** Дальнейшее совершенствование и постепенное преобразование социалистических производственных отношений в коммунистические. М., «Высшая школа», 1963.

**Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі зарубежных славянскіх народаў.** 1906—1962. Бібліяграфія. Мінск, выд. АН БССР, 1963.

**Социалистический реализм — главная линия развития советской литературы.** Рекомендательный указатель литературы. Л., 1963.

## ДАПАМОГА ЗАВОДСКІМ КАЛЕГАМ

Члены ўніверсітэцкай групы таварыства «Веды» часта выступаюць перад рабочымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі нашага завода з лекцыямі і дакладамі на разнастайныя тэмы.

Перад рабочымі выступалі прафесар Г. М. Ліўшыц, дацэнты Р. А. Нікольская, М. Ц. Рамаnoўскі і ншыя. Прарэктар А. В. Кірсанаў прысвечаў свае выступленні Дню Савецкай Арміі і Дню Перамогі. Кафедра эканамічнай геаграфіі па ініцыятыве праф. Н. Е. Рагозіна на нашым прадпрыемстве арганізавала пастаянны лекторый «Ля карты свету». Цікавую лектарскую работу вядуць выкладчыкі хімфака. Яны растлумачвалі ў сваіх лекцыях на заводзе рашэнні снежаньскага і лютаўскага Пленумаў ЦК КПСС.

Члены ўніверсітэцкай групы таварыства «Веды» ўважліва прыслухоўваюцца да запатрабаванняў і пажаданняў сваіх слухачоў на нашым заводзе, улічваюць іх у сваёй працы. Наш калектыў асабліва ўдзячны члену бюро групы тав. В. С. Ямеліну, які ў любы час забяспечвае чытанне лекцый і правядзенне іншых мерапрыемстваў па лініі групы на нашым заводзе.

**М. І. ТАРАЙКОВІЧ,**
**старшыня групы таварыства «Веды» на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

## *Чалавек моцны дружбай*

Шэфскія сувязі ўніверсітэта з нашай вайсковай часцю з'яўляюцца яркім праяўленнем непарушнай дружбы і адзінства арміі і народа. Выступленні вучоных з лекцыямі перад асабовым складам плённа ўплывае на павышэнне ведаў салдат і афіцэраў, на іх агульнае культурнае развіццё.

Мудра гаворыць наш народ: «Птушка моцная крыламі, а чалавек — дружбай». Наша армія моцная сваёй зброяй, але ў сто разоў больш моцнай робіць яе падтрымка народа, яго любоў і клопаты. Дружба і ўвага, якія усталяваліся паміж калектывамі ўніверсітэта і нашай часці — наглядная праяўленне духоўнай блізкасці паміж народам і яго арміяй.

Шэфская сувязь ужо прыносіць свае вынікі: надзённыя праблемы навукі сталі прадметам самаадукацыі афіцэраў; ваеннаслужачыя пераканаліся ў неабходнасці далейшага павышэння сваіх ведаў. Запаветнай марай многіх нашых салдат стала атрыманне ведаў пасля дэмабілізацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Калектыў наш жадае і надалей пашыраць сувязі з БДУ.

**КРАСНІКАЎ.**


**Рэдактар М. ІОСЬКА.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03565. Тыр. 2000. Зак. 1390.